Практычнае радзімазнаўства

# ТОЕ, ШТО НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Першы рэспубліканскі краязнаўчы форум, які пройдзе ўжо на наступным тыдні, збярэ ў сталіцы амаль тры сотні краязнаўцаў, супрацоўнікаў музеяў і бібліятэк, выкладчыкаў і студэнтаў з розных рэгіёнаў — усіх тых, хто цікавіцца гістарычнымі, культурнымі і прыроднымі адметнасцямі нашых гарадоў і вёсак. Маштабнае мерапрыемства ладзяць сумесна Нацыянальны гістарычны музей і Беларускі фонд культуры пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства культуры, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі, Выдавецкага дома «Звязда».**

Удзельнікі форуму абмяркуюць на тэматычных секцыях розныя аспекты краязнаўства і яго ролю ў сістэме навукова-даследчай работы, у вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі, у развіцці турызму, а таксама прыгадаюць знакавых асоб-даследчыкаў і ўшануюць пераможцаў конкурсу выданняў 2017—2019 гг. на краязнаўчую тэматыку. Пра падрабязнасці форуму і яго галоўныя задачы «Звязда» распытала **дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Паўла САПОЦЬКУ.**

— Форум пройдзе ў межах Года малой радзімы 12—13 сакавіка гэтага года. Ахвотных узяць у ім удзел было вельмі многа, таму мы падоўжылі тэрмін прыёму заявак да 1 лютага, і нават пасля гэтай даты было шмат тэлефанаванняў ад зацікаўленых з усіх абласцей — на сёння ўдзельнікаў каля 270—280 чалавек. Наша мэта — зладзіць такое свята сустрэчы краязнаўцаў, якое дазволіць пазнаёміцца краязнаўцам з розных рэгіёнаў, падзяліцца назапашаным вопытам і канкрэтнымі ініцыятывамі, прэзентаваць свае выданні, нешта прапанаваць адно аднаму і далей развіваць гэты дыялог, які, спадзяюся, атрымаецца ўсталяваць на пляцоўцы гістарычнага музея. Канешне, краязнаўчая лінія з'яўляецца адной з найважнейшых у дзейнасці любога музея, тым больш у рэгіёнах захаваліся і назвы «Гісторыка-краязнаўчы музей», а мы — Нацыянальны гістарычны музей — у адпаведнасці з Кодэксам аб культуры Беларусі, выступаем каардынацыйным і метадычным цэнтрам для ўсіх краязнаўчых і прыродазнаўчых музеяў. І таму, на мой погляд, цалкам лагічна і дакладна, што менавіта наш музей стане платформай Першага Рэспубліканскага краязнаўчага форуму (спадзяюся, канешне, што будуць і наступныя, але наконт іх перыядычнасці гаварыць пакуль рана).

Некаторыя абсалютна няслушна кажуць: маўляў, што такое форум, канферэнцыя ці круглы стол — удзельнікі прыехалі, пабалакалі, абмяняліся падарункамі і разышліся ў розныя бакі. Сведчу з уласнага вопыту: наадварот, прыехалі, пазнаёміліся, абмяняліся візітоўкамі — і потым завязаліся кантакты, якія дазваляюць супрацоўнічаць, абменьвацца не толькі інфармацыйнымі пісьмамі, але і дэлегацыямі... У Казахстане на форуме навуковай і творчай інтэлігенцыі я пазнаёміўся з людзьмі з Узбекістана, якія працуюць на розных гуманітарных кафедрах, — і ўжо тры гады мы дасылаем адно аднаму інфармацыйныя лісты, вядзём сумесныя даследаванні і рыхтуем публікацыі; у 2018 годзе я накіраваў навуковага супрацоўніка музея на Ісык-Куль у археалагічны летнік, зараз два чалавекі ляцяць ва Узбекістан для ўдзелу ў міжнародным інтэлектуальным маладзёжным форуме, мы таксама запрашаем узбекскіх спецыялістаў да сябе — атрымліваецца моцны, змястоўны, паўнавартасны рух, які дае плён у выглядзе канкрэтных праектаў, і гэта вельмі здарова. Тое самае мусіць адбыцца і на нашым краязнаўчым форуме: мы павінны ведаць адзін аднаго, сябраваць, супрацоўнічаць, быць адно аднаму карыснымі. Вядома, стараемся вырашыць усе задачы, якія прапісаны ў палажэнні форуму: і патрыятычнае выхаванне, далучэнне моладзі да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Беларусі, і стварэнне пляцоўкі для дыялогу, і стымуляванне даследчай работы, краязнаўчага пошуку, але галоўнае — трэба пазнаёміцца адно з адным, абмяняцца думкамі і рушыць далей разам, каб кожны руплівец у рэгіёне ведаў і разумеў, што ён такі не адзін, ёсць аднадумцы, якія таксама адраджаюць нашу спадчыну, культуру, вядуць даследаванні, выдаюць кнігі, супрацоўнічаюць з акадэмічнай навукай, з грамадскімі аб'яднаннямі...

***— Ці памылюся я, мяркуючы, што адна з задач форуму — падвядзенне вынікаў трохгоддзя малой радзімы?***

— Менавіта так. Справа ў тым, што кожны рэгіён мае гонар падзяліцца сваімі напрацоўкамі, бо Год малой радзімы як агульнарэспубліканская акцыя пад патранатам Прэзідэнта праходзіў тры гады і насамрэч шмат што было зроблена. Але на слыху, на старонках рэспубліканскіх СМІ, у радыё- і тэлеэфіры прадстаўлены, так скажам, найбольш буйныя праекты. А хацелася б, каб краіна ведала і тых сваіх герояў, якія працуюць на месцах. На мой погляд, менавіта гэтыя таленавітыя, няўрымслівыя інтэлектуалы — краязнаўцы, мастакі, выкладчыкі, пісьменнікі — ствараюць асяродак, асаблівую культурніцкую прастору. Наш вядомы пісьменнік і краязнавец Алесь Карлюкевіч любіць выраз «геній месца» — вось гэтыя людзі якраз з'яўляюцца геніямі сваіх мясцін, і яны вартыя таго, каб іх ведалі больш шырока. І ў якасці падтрымкі мы зладзілі конкурс краязнаўчых выданняў, на які паступіла больш за 200 заявак з усіх рэгіёнаў Беларусі — ад выдавецтваў, бібліятэк, архіваў, музеяў, нацыянальных культурных аўтаномій беларусаў свету і асобных краязнаўцаў. Выданні, якія прадстаўлены ў гэтай апошняй катэгорыі, могуць выглядаць прымітыўна ў сэнсе тэхнічнага ўвасаблення, афармлення, але яны надзіва глыбокія і змястоўныя і тым асабліва каштоўныя.

На бягучым тыдні журы ў пашыраным складзе вызначыць пераможцаў конкурсу ў розных намінацыях, а таксама ўладальніка Гран-пры. Сярод ключавых тэматычных кірункаў — 75-годдзе Вялікай Перамогі, кнігі для дзяцей і моладзі, славутыя імёны Бацькаўшчыны, шматканфесійнасць і шматэтнічнасць Беларусі... Дарэчы, усе конкурсныя выданні можна будзе ўбачыць на выстаўцы ў Нацыянальным гістарычным музеі, гэтаксама як краязнаўчую літаратуру розных часоў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — некаторым экспанатам ужо 200 і больш гадоў!

***— Напэўна, у форуму будзе і матэрыяльны вынік?***

— Абавязкова будзе, мы выдадзім зборнік дакладаў — самыя цікавыя з іх вызначыць рэдкацыйная рада з прадстаўнікоў Акадэміі навук, вышэйшых навучальных устаноў, арганізатараў форуму і нашага партнёра — кампаніі JTI, з дапамогай якой кожны ўдзельнік форуму атрымае зборнік у электронным і друкаваным выглядзе. Для нас гэта вельмі важна, бо напісанае застаецца. Кнігі плануецца перадаць ва ўсе рэгіёны, а таксама ў Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, на базе якога працуе кафедра падрыхтоўкі краязнаўцаў, Універсітэт культуры і мастацтваў, вядучыя бібліятэкі, каб выданне працягвала жыць і быць карысным.

Адна з адметнасцяў першага Рэспубліканскага краязнаўчага форуму — удзел у ім школьнікаў і студэнтаў. Для іх будуць працаваць асобныя секцыі — «Пазашкольнае краязнаўства: вопыт рэгіёнаў» і канферэнцыя «Моладзь і краязнаўства», на якіх вучні і студэнты змогуць прадэманстраваць сваю работу і ведаць, што яна будзе заўважана і ацэнена. Кожнаму ўдзельніку арганізатары ўручаць адпаведны сертыфікат і прома-пакет, найлепшыя даклады ўключаць у выніковы зборнік, а іх аўтары атрымаюць спецыяльныя прэміі ад журы.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Таямніцы сталіцы

# Дзе шукаць мінскіх прывідаў?

**За савецкім часам, калі пачалася барацьба з рэлігіяй, дасталася і «нячысцікам»: як верыць, так і распавядаць пра іх стала не модна. А пасля Другой сусветнай памiралі многія з тых, хто мог яшчэ памятаць тыя ці іншыя паданні. І тым не менш у сталіцы яшчэ засталіся месцы, дзе быццам жылі чароўныя істоты. На Гандлёвай вуліцы стаіць дом з прывідамі, а па Свіслачы плавае русалка. Быў у Мінску і свой Вадзянік. Юбілейная плошча раней нездарма называлася Змеевай гарой. З Залатой Горкай наогул звязана некалькі незвычайных гісторый. Пра касцёл Святога Роха захавалася паданне пра выратаванне ў XIX стагоддзі жыхароў горада ад эпідэміі халеры.**



Пагаворваюць, быццам у адбудаваную наноў ратушу вярнуўся прывід. Некаторыя вераць, што многа сакрэтаў яшчэ схавана ў мінскіх падзямеллях, а можа, менавіта там варта пашукаць старыя скарбы? На Кальварыйскіх могілках раней сустракалі Белую панну (здань, у якую ператварылася маладзенькая прыгажуня, — яе пахавалі, калі яна ўпала ў летаргічны сон). Яшчэ адна няшчасная Белая панна блукае па Лошыцкім парку. Гэта ўжо прывід Ядвігі Любанскай, якая з-за няшчаснага кахання ў мінскага губернатара Мусіна-Пушкіна ўтапілася ў рацэ. А ў вясновых туманах над ракой тут бачаць белага каня. На руінах млына быццам бы жывуць ведзьмы, якія наведвальнікаў парка «водзяць за нос» — прымушаюць хадзіць кругамі. А яшчэ зусім




нядаўна моладзь прыходзіла сюды са сваімі жаданнямі да заручальнага дуба, пакуль дрэва не пацярпела ў час навальніцы...

Чароўных гісторый, звязаных з Мінскам, набярэцца не адзін дзясятак! Пра многія з іх можна даведацца з новай кнігі краязнаўца Уладзіміра Валожынскага «Мінск у легендах, міфах і паданнях», у якой ён пастараўся аб'яднаць гісторыі, сабраныя з розных крыніц: кніг, часопісаў, газет, публікацый у інтэрнэце, лістоў чытачоў сайта «Мінск стары і новы», таксама даследчык запісваў сведчанні розных людзей.

Падчас прэзентацыі аўтар заўважыў, што з многімі старымі назвамі (прадмесцяў, сядзіб, ваколіц) былі звязаны пэўныя паданні, і гэта толькі адна з прычын, чаму варта больш увагі ўдзяляць беларускай міфалогіі. Не ўсе гістарычныя звесткі маглі патрапіць у летапісы, хронікі, мемуары, — часам пра страчаны кавалак мінулага можна даведацца з паданняў, што перадаваліся з вуснаў у вусны. Міфы могуць даць уяўленне і пра светапогляд нашых продкаў, іх фантазію. Многія з іх падказваюць, як жыць у згодзе з блізкімі, з прыродай.

За мяжой чароўныя істоты дапамагаюць зарабляць грошы: у розных краінах дзейнічаюць музеі міфалогіі, у замку Дракулы не пераводзяцца турысты, на аснове паданняў ствараюцца папулярныя кнігі, фільмы, карціны і музычныя творы.

Чароўныя гісторыі Мінска таксама маглі б паслужыць літаратарам, рэжысёрам, мастакам. Ужо сёння яны запатрабаваныя ў турыстычнай сферы, прычым попыт на прывідаў і русалак ёсць як у саміх беларусаў, так і ў замежных гасцей.

У кнізе пададзены розныя легенды — і старажытныя, і тыя, што ўзніклі за савецкім часам. Прыемны бонус — знаёмства з сучаснай вулічнай тапанімікай. Напрыклад, можна даведацца, які кавалак сталічнага праспекта Незалежнасці ў 50-60-я гады зваўся Брадвеем. Якія будынкі мясцовыя жыхары назвалі «бігудзі», «караблік», «каза», «кукурузнікі», «долар». Дзе знаходзяцца «Поле цудаў», «курлымурлы», «Пентагон», «гарбаты мост» і «пуп зямлі». І куды ісці, калі ў Мінску вам прызначылі сустрэчу ля «чупа-чупса», «на трубе» ці «на Панікоўцы».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**